# ПЛЕНАРНЫЕ ДОКЛАДЫ

**В. В. Калацэй,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*
*загадчык кафедры этналогіі і фальклору*

## МАСТАЦТВА ВУСНАЙ ТРАДЫЦЫІ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ: ЗАДАЧЫ І ВЫНІКІ

Як адзначаў Леў Гумілёў, людзі заўсёды незадаволены часам, у якім жывуць, прычым, найбольш прэтэнзій да свайго існавання агучвалі італьянцы Рэнесансу, да эпохі якіх (дзе дзейнічалі Бацічэллі, Да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэль) большасць знаўцаў мастацтва і гуманітарыяў дагэтуль ставіцца амаль з рэлігійным трымценнем. Сёння гуманітарыі з незадаволенасцю разважаюць пра: постфігуратыўныя культуры (дзе дарослыя вымушаны вучыцца ў моладзі); пра ляноту новага т. зв. digital-пакалення (якое, маўляў, цікавяць толькі гаджэты); пра нежаданне моладзі знаёміцца са спадчынай сваіх продкаў і г. д. Разам з тым, я, каля 30 апошніх гадоў (першапачаткова ў Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі) аднаўляючы мастацтва вуснай традыцыі, неаднаразова чуў (часам ад тых жа гуманітарыяў): «Ну што вы носіцеся са сваім фальклорам?», – ці: «Навошта вы цягніце дзяцей у пячоры?» і г. д. Паколькі падобнае незадавальненне я чую і сёння, падчас працы ва ўніверсітэце, варта высветліць: у якія «пячоры» фалькларысты цягнуць моладзь; дзе і як узнікла патрэба сучасных еўрапейцаў у азнаямленні з традыцыйным мастацтвам сваіх продкаў; што можна чакаць ад вынікаў задавальнення гэтай патрэбы ў галіне вышэйшай школы XXI ст.

У XX ст. у Еўропе працягвалася філалагічнае вывучэнне фальклору, распачатае ў XVIII. На фоне індустрыялізацыі традыцыйная культура і яе мастацтва (як альтэрнатыва дэгуманізаванаму свету рэчаіснасці) сталі неўзабаве асэнсоўвацца як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вартыя комплекснага аналізу з’явы. XX ст. з дзвюма Сусветнымі войнамі, генацыдам, таталітарызмам, сацыяльнымі эксперыментамі, экалагічнымі крызісамі, разбурэннем нормаў этыкі ў грамадстве прымусіла шэраг даследчыкаў крытычна перагледзіць вынікі гісторыі трох мінулых стагоддзяў, якія раней асэнсоўваліся як прагрэсіўны рух да «свабоды, равенства і братэрства». Найбольш глыбока інтарэс да традыцыйнай культуры і мастацтва кантынента ў гэты час быў асветлены ў працах філасофскай школы Рэнэ Генона (мал. 1). Заснавальнік і ўдзельнікі гэтай школы прапанавалі недвухсэнсоўную дыягностыку стана сучаснага ім Захаду як «інтэлектуальны і культурны крызіс». Квінтэсенцыяй сэнсу іх поглядаў на стан сучаснай ім культуры Еўропы стаў парафраз Генона: «Усё, што еўрапейцы чакаюць ад будучыні, насамрэч знаходзіцца ў іх мінулым» [1, с. 12–13]. Філосаф меў на ўвазе, у першую чаргу, псіхалагічную і фізічную раўнавагу асобы з яе сацыяльным і прыродным асяродкам. На погляд Генона, людзі традыцыі заўсёды больш шчаслівыя і самарэалізаваныя, чым індустрыялізаваныя еўрапейцы XX ст., а плённая сустрэча з традыцыяй і яе мастацтвам цягам гісторыі чалавецтва адбывалася ўжо не аднойчы ды мае перыядычны характар (няхай сабе працягласць такога перыяду часам вымяраецца тысячагоддзямі).

Кнігі і актыўная асветніцкая пазіцыя Р. Генона паўплывалі на шэраг мысліўцаў і творчых асоб. Сярод інтэлектуалаў з Еўропы і Азіі, з якімі сустракаўся, ці на якіх зрабіў уплыў Генон, называюць Гвіда дэ Джорджыа, Юліуса Эволу, Мірчу Эліядэ, Андрэ Жыда, Фрыцьёфа Шуона, Тытуса Буркхарта, Аляксандра Дугіна, Гейдара Джэмаля, Авігдора Эскіна, Алега Гуцуляка і інш. Яны змадэлявалі ў сярэдзіне XX ст. шэраг з’яў, сукупнасць якіх можна лічыць пачаткам фальклорнага руху ў Еўропе: філасофскую школу *інтэгральнага традыцыяналізму*; т. зв. *гісторыка-рэлігійны* напрамак у антрапалогіі; творчасць Дж. Р. Р. Толкіена як аснову жанра *fantasy* ў сусветным мастацтве; *«маладзёжныя бунты»* 1960-х; асветніцкую дзейнасць К. Орфа (з агульнанацыянальнай сістэмай музычнага выхавання *Schulwerk* на аснове фальклору); пашырэнне *еўрапейскіх фолк-клубаў* XX ст. як асяродкаў захавання народнай музыкі – кантры, блюза, фламэнка, сардзінскіх традыцыйных спеваў «cantoatenore» і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Мал. 1.*
Ренэ Генон



*Мал. 2.*
Мірча Эліядэ




*Мал. 3.* Элементы «Intangible Cultural Heritage List» на інтэрактыўнай карце

Новае пакаленне еўрапейцаў вучылася адрозніваць аўтэнтычны фальклор (*мастацтва вуснай традыцыі*) ад яго сурагата – стылізацыі (*прафесійнага мастацтва пісьмовай традыцыі «па матывах» фальклору*). Па выкладках аналітыкаў, дзве гэтыя з’явы – рэчы прынцыпова розныя; яны непараўнальныя, а замена першай на другую (нават пры знешнім падабенстве) немагчымая без прафанацыі. Вось як размяжоўваў аўтэнтычную аснову сезонна-рытуальнай дзеі і яе сцэнічную стылізацыю заснавальнік гісторыка-рэлігійнага падыходу да міфалогіі румынска-амерыканскі даследчык М. Эліядэ (мал. 2): «…відавочна якасная розніца паміж дзвюма катэгорыямі з’яў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рытуальная дзея… забяспечвала выратаванне суполкі, з’ядананай ёю ў адзінае цэлае, а сцэнічная пастаноўка …імкнулася да ўздзеяння зусім іншага кшталту (эстэтычнага, эмацыйнага) …паміж двума акрэсленымі планамі існуе разрыў …Дыстанцыя паміж тым, хто …асабіста бярэ ўдзел у сакральным рытуале …і тым, хто атрымлівае эстэтычнае задавальненне …ад суправаджаючай яго музыкі, невымерная» [5, с. 142]. Трэба адзначыць, што ў цытаце з эсэ М. Эліядэ гаворка ідзе пра аўтэнтычныя сезонныя (каляндарныя) рытуалы, якія з’явіліся асновай тэатральных пастановак на сцэне. Першае выданне эсэ, адкуль гэтыя цытаты, – 1937 г., таму, калі я пачуў у 1999 г. ад кіраўніка фальклорнага калектыва з Бухарэста: «У нас таксама быў народны балет… у 1950-я г. Зараз – збольшага займаемся аўтэнтычным танцам», – я падумаў: «Румыніі з Мірчай Эліядэ – пашанцавала».

Пераключэнне ад *эмацыйна-духоўнага яднання аўтара і рэцыпіента* ў традыцыйным мастацтве на *выключна эстэтычныя арыенціры* ў мастацтве ўрбанізаванага грамадства М. Эліядэ тлумачыць комплексам непаўнавартаснасці еўрапейскай культуры. Творцы акадэмічнага напрамку прызнаюць за аўтэнтычным мастацтвам і традыцыйнай культурай шэраг пераваг, але істэрычна не жадаюць да іх звяртацца, ахоўваючы ўласныя сцэнічныя дасягненні, якія не могуць прызнаць недасканалымі. Сапраўды: «ці вартая такіх намаганняў і высілкаў іх творчасць, калі яна не можа больш лічыцца духоўнай вяршыняй і адзінай магчымай у XX ст. культурай» [5, с. 143], – мадэлюе думкі прыхільнікаў акадэмізаванага мастацтва М. Эліядэ. Развіваючы высновы пра комплексы непаўнавартасна еўрапейскай культуры XX ст., даследчык пераканаўча даказвае, што традыцыйны светапогляд і заснаваныя на ім аўтэнтычныя формы мастацтва мелі ў якасці асноўнай т. зв. «сатэрыялагічную» (выратавальную) функцыю [5, с. 142]: скіраванасць на ахову законаў захавання і аднаўлення супольнасці носьбітаў традыцыі і на ахову навакольнага асяродку жыцця, фактычна, – т. зв. матчынага ландшафта этнасу. Зыходзячы з падобнай логікі: *знікае традыцыйны светапогляд і заснаваныя на ім аўтэнтычныя формы мастацтва* → непазбежна *разбураецца і гіне супольнасць носьбітаў традыцыі* разам са сваёй культурай ды ўласным матчыным ландшафтам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пагадзімся, што інтарэсы самазахавання народа пераважваюць інтарэсы і комплексы абмежаванага кола стылізатараў народнага мастацтва, а таксама ворагаў фальклору з іншых асяроддкаў. Да таго ж у XXI ст. фальклор і традыцыйная культура былі ўзяты пад заканадаўчую ахову «Канвенцыяй аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны» ЮНЭСКА – спецыялізаванай установай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры. Да дадзенай канвенцыі Беларусь далучылася адной з першых – у 2004 г. (Указ Прэзідэнта Рэсп. Беларусь № 627 ад 29.12.2004).

Нематэрыяльная культурная спадчына (паводле *англ.* Oral and Intangible Heritage of humanity – вусная і па-руску «неосязаемая» спадчына чалавецтва) – узоры народнай творчасці і тэхналогіі рамёстваў, якія вусным шляхам перадаюцца ад пакалення да пакалення, няспынна аднаўляюцца супольнасцямі і суполкамі ў сувязі з прыродным атачэннем і гісторыяй, фарміруюць у іх пачуццё самабытнасці і спадкаемства, спрыяюць творчасці чалавека і павазе да культурнай разнастайнасці. Элементы, якія міжнародная супольнасць прызнае НКС, бяруцца пад ахову і ўносяцца ў спіс «Intangible Cultural Heritage List» (мал. 3). Адзнака такой спадчыны – жывое бытаванне традыцыі, яе існаванне ў побыце народа и вусная пераемнасць, якая не характэрная для стылізаванага прафесійнага мастацтва «па матывах» фальклору.

На прыканцы XX ст. большасць зарыентаваных на народнае мастацтва гледачоў і ў Беларусі стылізацыямі «аб'елася». Стылізаванае мастацтва не захоўвае этнічных адзнак, яно стандартна-касмапалітычна і не можа прэзентаваць народ на міжнародным узроўні. Таму асобы і творчыя калектывы з атрымаўшай у 1991 г. суверэнітэт Беларусі, якія ў XXI ст. пачалі працаваць з фальклорам у аўтэнтычным напрамку, атрымалі прызнанне і поспех у розных сферах. Беларусы мяжы XX–XXI ст., якія працавалі з аўтэнтычным фальклорам у галінах: а) навукі; б) прафесійнай мастацкай адукацыі; в) грамадскага і фестывальнага руху; г) арт-бізнэсу – паспяхова ўкаранілі новыя ідэі пра этнаэкалагічны патэнцыял мастацтва вуснай традыцыі. Схільнымі да новых ідэй аказаліся Міністэрства культуры, а таксама рэктарат БДУКМ на чале з доктарам педагагічных навук Ядвігай Грыгаровіч, у выніку чаго ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2003 г. універсітэт стварыў Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, а ў 2004 г. – Цэнтр захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў (загад рэктара № 53 ад 10.06.2004).

У напрамку навукі і прафесійнай мастацкай адукацыі на падставе мастацтва вуснай традыцыі стала працаваць кафедра этналогіі і фальклору БДУКМ. У адкрытай тут у 2004 г. спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» да 30 % абітурыентаў набіраюцца з дыпламантаў фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», прайшоўшых школу жывога пераймання фальклору этнахарэолага Міколы Козенкі ў якасці зместу і выніку падрыхтоўкі да фэсту. Патэнцыял гэтай сістэмы вывеў калектывы «Этнасуполка» (курс ст. выкладчыка Т. Пладуновай), «Страла» (курс ст. выкладчыка Э. Шчадрыной), «Ра́ме» (курс дацэнта В. Калацэя), «Агнявец» (курс дацэнта Н. Петуховай), часам аб'яднаныя ў зводную «Талаку», на сцэну міжнародных фестываляў Belfort-2003 і 2007» (Францыя); «Покровские колокола-2006 і 2011» (Вільнюс), «Slaavivalgis-2013» (Эстонія), «Как на речке было на Фонтанке-2013–2019» (Санкт-Пецярбург), «Laiksne 20 jubileu-2013» (Рыга), «Rudeninės-2014 і 2016» (Літва); «Etnokrakow-2015» (Польшча); «Baltica-2014 і 2015» (Літва, Латвія) і інш.

Такая запатрабаванасць – уражвае, але яна не эксклюзіўна. Разам з тым, у свеце ёсць канцэртныя пляцоўкі, куды запрашаюць сапраўды адмысловых артыстаў. Характэрна, што створаны з педагогаў і выпускнікоў кафедры калектыў «Vietakh» 27 красавіка 2017 г. прадставіў Беларусь на другой па значэнні міжнароднай пляцоўцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый – ў Палацы Нацый у Жэневе (мал. 4), дзе была наладжана «Беларускае свята вясны», комплекснае мерапрыемства, дзе акрэдытаваныя пры ААН дыпламаты і грамадскія дзеячы азнаёміліся з нематэрыяльнай культурнай спадчынай Беларусі і намаганнямі дзяржавы і грамадства па яе захаванні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Мал. 4.* Палац Нацый.
Жэнева, 2017 г.



*Мал.* 5. «Vietakh» у Палацы Нацый.
Жэнева, 2017 г.



*Мал. 6.* Нацыянальны цэнтр
выканальніцкіх мастацтваў.
Пекін, 2019 г.



*Мал. 7.* «Vietakh» у Нацыянальным цэнтры
выканальніцкіх мастацтваў.
Пекін, 2019 г.

Як адзначылі начальнік аддзела Офіса Генеральнага Дырэктара Адзялення ААН у Жэневе Салман Бал, дырэктар офіса ЮНЕСКА ў Жэневе Абдулазіз Ал Музаіні, пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ААН у Жэневе Юрый Амбразе́віч – адмысловасць Беларусі як краіны, дзе нематэрыяльная культурная спадчына і фальклор захаваны ў «жывым» стане, цяжка пераацаніць. Наведвальнікам «Залы страчаных крокаў» Палаца Нацый была прадэманстравана фотавыстава пра архітэктуру, святы і абрады нашай Радзімы ад аддзела навукова-метадычнага забеспячэння аховы гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі (загадчык тагачаснага аддзела – Ала Сташкевіч), а аўтэнтычную этнафо́нію песень, смыковай і дударскай музыкі Беларусі ім прадставіў «Ве́тах» (мал. 5). Акрамя МЗС і жэнеўскага пастпрэдства Беларусі пры ААН у арганізацыі форуму бралі ўдзел кампанія «Джапа́н таба́ка інтэрнэйшнл эсэндзі», фонд «Культурная спадчына і сучаснасць», кафедры этналогіі і фальклору, а таксама народнага дэкаратыўна-побытавага мастацтва БДУКМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Запрошаныя гледачы (а жадаючых пазнаёміцца з фальклорам Беларусі аказалася шмат – завіталі нават прадстаўнікі дыпкорпуса далёкіх Аўстраліі і Новай Зеландыі) не засталіся статыстамі. Пад архаічную мелодыку загукання вясны на стылізаваных дрэвах былі развешаны сяточныя выявы птушак, прадстаўнікі інтэрнацыянальнай аўдыторыі прашліся ў веснавых карагодах, пагулялі ў «Явар» і вырабілі «па» беларускіх побытавых танцаў. Раскаванасці, шчырасці атмасферы спрыяла тое, што прысутным была даведзена: яны бяруць удзел у дзеяннях, якія перанятыя непасрэдна ад носьбітаў жывой традыцыі. Міжнародная супольнасць у XXI ст. разумее, што ўмова захавання вуснай і нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва – яе «жывое» існаванне ў паводзінных мадэлях людзей, у перадачы паміж пакаленнямі народа. Зацвердзіць і ўхваліць гэта ў чарговы раз на прыкладзе нашай Радзімы і была наканавана міжнароднай імпрэзе ў Палацы Нацый.

Ахова НКС напрыканцы другога дзесяцігоддзя XXI ст. стала трэндам. Таму спецыялісты па ёй (асабліва тыя, хто авалодаў навыкамі мастацтва вуснай традыцыі) запатрабаваныя на найвыбітных канцэртных пляцоўках свету, у тым ліку ў краінах, якія ўваходзяць у лік яго эканамічных лідэраў. У 2019 г. выкладчыкі і выпускнікі кафедры этналогіі і фальклору далі канцэрт на найбольш вядомай і прэсціжнай сцэнічнай пляцоўцы Кітая.

Нацыянальны цэнтр выканальніцкіх мастацтваў (Оперны тэатр), які знаходзіцца ў гістарычнай частцы Пекіна, займае 150 тысяч квадратных метраў, з’яўляецца найбуйным тэатрам оперы краіны, прычым – найбольш сучасным і эрганамічным (мал. 6). Сам будынак уяўляе сабой купал са шкла і тытана, выкананы ў форме эліпса, агульнай вышынёй у 46 метраў. Будаўніцтва тэатра ў гістарычным цэнтры горада планавалася да Алімпіяды ў Пекіне, ішло на працягу некалькіх гадоў, а было скончана ў 2007 г. Аўтарам праекту быў француз Поль Андрэ. Паводле яго задумы ўваход у тэатр знаходзіцца пад зямлёй на глыбіні 8 метраў і ўяўляе сабой тунэль пад шкляным падводным дахам, зверху якога – штучнае возера.

У залах цэнтра праходзяць пастаноўкі не толькі опер на сюжэты з гісторыі краіны, але і дэманструюцца шэдэўры сусветнай опернай класікі. Вядома, «душой» тэатра з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пекінская опера – самабытны від мастацтва, які лічыцца нацыянальным і сусветным гісторыка-культурным здабыткам. Этнічная опера як асобны жанр фарміравалася ў Пекіне на працягу 200 гадоў, а гісторыя з'яўлення тэатра ў Кітаі налічвае больш за 8 стагоддзяў.

15 мая 2019 г. у цэнтры ў рамках праекта «Музыка свету» пекінскай публіцы было прапанавана пазнаёміцца з фальклорам Беларусі. Канцэрт ансамбля смыковой і дударскай музыкі «Ветах» (мал. 7) з Мінска арганізавалі Міністэрства культуры і Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь пры ўдзеле ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Беларусь упершыню брала ўдзел у дадзеным праекце. Ён існуе з 2010 г. і накіраваны на развіццё міжкультурных абменаў і папулярызацыю традыцыйных музычных мастацтваў народаў свету. У рамках гэтага праекта арганізавана больш за 120 выступаў. Раней удзел у ім бралі Бразілія, Іспанія, Манголія, Румынія, Эстонія, Паўднёвая Афрыка і Паўднёвая Карэя, а таксама іншыя краіны. У 2019 г. нашу краіну прадставіў калектыў «Vietakh», створаны яшчэ ў 1997 г. Сёння яго ўдзельнікі з'яўляюцца выкладчыкамі і выпускнікамі кафедры этналогіі БДУКМ: Вячаслаў Калацэй, Таццяна Пладунова, Эвеліна Шчадрына, Вячаслаў Красулін, Павел Ляшок, Аляксандр Масібут. У 1990-х гг. «Ветах» ствараўся як гурт смыковой і дударскай музыкі, а таксама спеваў, арыентаваны на аўтэнтычную традыцыю. Побытавы танец ад Міколы Козенкі стаў «трэцім кітом», на якім грунтуецца рэпертуар калектыву. Ансамбль выступаў у большасці еўрапейскіх краін ад Балкан да Атлантыкі. Для яго запрашэння ў Пекін працавалі журналіст-міжнароднік Вольга Гальпяровіч, дыпламат Вераніка Цімкіна, вялікі аб'ём работы правялі Міністэрства культуры Беларусі і БДУКМ.

Варта адзначыць, што «Ветах» – адзін з першых калектываў, вярнуўшых з 1990-х гг. у актыўную канцэртную практыку дуду-валынку беларусаў. Гэты музычны інструмент па парадзе ЮНЕСКА плануюць уключыць у пералік гісторыка-культурнай спадчыны чалавецтва ад Беларусі, паколькі ён – базавы элемент нацыянальнай этнафоніі. Запрашэнне гурта «Ветах» у Пекін – сведчанне дынамічнага развіцця культурнага абмену паміж нашымі краінамі, а таксама цікавасці кітайскай публікі да карэннага, сапраўды народнага мастацтва Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тое, што традыцыі варта захоўваць – сёння не аспрэчваюць, іншая справа – што і як рабіць, каб не падмяніць (а ў перспектыве – не вынішчыць) аўтэнтычную песню, танец, абрадавую дзею іх жа стылізацыяй? Для разумення архаічных і не характэрных сучаснасці культурных праяў Мірча Эліядэ, чыё імя носіць кафедра гісторыі рэлігій Чыкагскага ўніверсітэту [4], слушна раіць «наперад таго, каб іх судзіць …іх зразумець, зліцца з іх традыцыяй, якімі б не былі сродкі яе выразнасці…» [5, с. 143]. Ён сцвярджае, што комплексы непаўнавартаснасці «вынішчаюцца самім ходам гісторыі», калі з'явы традыцыйных культур будуць «вывучацца і трактавацца ў іх уласным кантэксце» [5, с. 144]. Іншымі словамі, без «эстэтызацыі і паляпшэння» стылізацыяй, калі традыцыя становіцца і мэтай, і сродкам навучання.

Мадэль універсітэцкай падрыхтоўкі спецыяліста-практыка, дзе мастацтва вуснай традыцыі – сродак і мэта навучання – была свядома ўкаранёная кафедрай этналогіі і фальклору БДУКМ. Дадзеная мадэль акамулюе вопыт выкладання Санкт-Пецярбургскай акадэміі музыкі (кансерваторыі) імя М. А. Рымскага-Корсакава і Вільнюскай акадэміі музыкі. Там (з падачы этнамузыколагаў Анатоля Мехняцова і Альгірдаса Віжынтаса) аддзяленні этнамузыкалогіі (дзе рыхтуюць «фальклрыстаў, якія спяваюць і граюць» – як альтэрнатыву «этнографам-архівізатарам» і «музыкам-стылізатарам» фальклору) існуюць шмат год, а зараз іх досвед з асяродкаў УВА інтэгруецца ў асяродак музычных каледжаў і сацыякультурную практыку Расіі і Літвы. Дыдактыка на кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ пабудавана на двух асноўных прынцыпах: «курс майстра» (*педагог набірае курс, вядзе на ім спецпрадметы і кіруе дыпломным праектам*) і «метад дэманстратыўнай антрапатэхнікі» (*пераймане твораў выключна вусным шляхам – непасрэдна ад носьбітаў ці з іх аўдыё- і відэазапісаў*). Сама мадэль падрыхтоўкі спецыяліста лагічна аб'ядноўвае пачатак, методыку і фінальную атэстацыю навучання (мал. 8).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Культурна-антрапалагічная экспедыцыя на I курсе | Яе вынікі як дыдактычны матэрыял на сярэдніх курсах | Дыпломны праект паводле матэрыялаў экспедыцыі на выпускным курсе |

*Мал. 8.* Мадэль падрыхтоўкі фалькларыста-практыка кафедры этналогіі і фальклору (2004–2020)



*Мал. 9.* Рэвіталізацыя Купалля як дыпломны праект этнафоназнаўцаў, 2012 г.


ДЫПЛОМ DIPLOMA

*Мал. 10.* Дыплом кафедры ад ЮНЕСКА за захаванне НКС, 2008 г.

У працэсе ўкаранення дадзенай мадэлі ў навучальны працэс БДУКМ дзейнасць кафедры набыла дасканалую форму і яна «адбылася» як кафедра сучаснай практычнай фалькларыстыкі. Як прыклад паспяховасці этнамастацкай адукацыі кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ можна прывесці выпуск спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» 2013 г., *навукова-даследчыя* дыпломныя работы якога (выкананыя на падставе ўзгаданай вышэй мадэлі) атрымалі выключна прызавыя катэгорыі: першую (3 работы) і другую (1 работа) на прэсціжным Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў. А чатыры іх аўтары (100 % ад гадавога выпуску спецыялізацыі) сталі магістрантамі Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Маркер *творчых поспехаў* этнафоназнаўцаў БДУКМ – шматлікія дыпломы міжнародных фальклорных фестываляў, а таксама спецыяльныя дыпломы Фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы творчай моладзі, якія атрымалі фальклорныя ансамблі кафедры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Талака» (2013), «Страла» (2015), «Ра́ме» (2017). Гэта – сведчанні высокай ацэнкі дзейнасці БДУКМ у галіне этнамастацкай адукацыі ў Беларусі і навуковай супольнасцю, і грамадствам краіны.

Сёння сітуацыя з еўрапейскім фальклорным рухам і яго ўплывам на этнамастацкую адукацыю даволі неадназначная. Існуюць прыклады, калі аднаўленню традыцыі на вёсцы спрыяў вопыт і дапамога гараджан (мал. 9) – як фалькларыстаў-прафесіяналаў, так і ўдзельнікаў постфальклорнага руху – адбываецца «…размыканне “маладзёжных” і “гарадскіх” рамак фальклорнага руху» [2]. Да маладзёжных рухаў і злучэння адукацыйных практык з досведам народнай педагогікі сёння пачынае праяўляць цікаўнасць міжнародная супольнасць. З падачы ЮНЭСКА помнікі фальклору (ці як зараз іх вызначаюць «помнікі нематэрыяльнай культурнай спадчыны») бяруцца пад ахову, а тыя, хто імкнецца іх захаваць – адзначаюцца спецыяльнымі ўзнагародамі (мал. 10).

Вядома, што постфальклорныя творчыя і сацыяльныя эксперыменты і іх адукацыйныя аналагі (новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі, звязаныя з фальклорам і народным ДПМ) – дагэтуль з’ява не адвольная, а рэакцыя нашых сучаснікаў на «выклік часу». На мяжы XX–XXI стст. шэраг еўрапейскіх навукоўцаў на розных мовах ізноў слушна ўздымаюць пытанне пра экалогію сучаснай культуры. Пра гэта шмат пісаў расійскі акадэмік Дзмітрый Ліхачоў, які пазначаў, што «забіць чалавека біялагічна мусіць невыкананне законаў біялагічнай экалогіі, а забіць чалавека маральна мусіць невыкананне законаў экалогіі культуры» [3, с. 4]. Прыкладна тое ж самае сцвярджаў літоўскі музыказнаўца Леанідас Мельнікас, які лічыў, што «ўлічваючы безабароннасць культурнага асяродку» нельга перавышаць яго «мяжу трываласці», каб не знішчыць [3, с. 5]. Сусветна вядомы беларускі аўдыёвізуальны антраполаг Зінаіда Мажэйка падкрэслівала, што ўвага грамадства да «экалогіі руральнай народна-музычнай культуры» здольна «захаваць у эпоху наступаючай сусветнай глабалізацыі самабытную этнічную непаўторнасць» народа [3, с. 7]. Таму ёсць падставы меркаваць, што фальклорны рух, узбуйненне этнамастацкай адукацыі як праявы ўвагі да традыцыйнай культуры з боку найбольш крэатыўнай часткі сучаснага беларускага грамадства – у XXI ст. будуць толькі паглыбляцца і ўзрастаць, набываць новыя раз-

настайныя формы па меры павелічэння пагрозы знікнення традыцыйных форм усходнееўрапейскай культуры.

1. *Генон, Р.* Очерки о традиции и метафизике / Р. Генон ; пер. с фр. В. Быстрова. – СПб. : Азбука, 2000. – 320 с.

2. *Жуланова, Н.* Молодежное фольклорное движение [Электронны рэсурс] / Н. Жуланова // Folklore.ru. – Рэжым доступу: http://www.folklore.ru/article/126-molodegfolk.html. – Дата доступу: 30.01.2020.

3. *Можейко, З.* Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем / З. Можейко. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 147 с.

4. Мирча Элиаде [Электронны рэсурс] // Upelsinka.com. – Рэжым доступу: http://eliade.upelsinka.com/biograph.htm. – Дата доступу: 12.01.2020.

5. *Элиаде, М.* Азиатская алхимия. Сборник эссе / М. Элиаде / пер. с рум., фр., англ. – М. : Янус-К, 1998. – 604 с.

**Т. В. Пищик,**
*кандидат экономических наук, доцент,*
*доцент кафедры философии и*
*методологии гуманитарных наук*

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИННОВАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ И МЕТОДОВ ОБУЧЕНИЯ КАК УСЛОВИЕ ПОВЫШЕНИЯ КАЧЕСТВА ПОДГОТОВКИ СТУДЕНТОВ СПЕЦИАЛЬНОСТИ «КУЛЬТУРОЛОГИЯ»

Сегодня глубокая модернизация системы образования в Республике Беларусь становится важнейшим национальным приоритетом. Исследования влияния системы образования на развитие экономической и социальной сферы государства позволяют констатировать, что положительная динамика определяется качеством, а не количеством образования. Согласно Национальной стратегии устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 г. (НСУР-2030), основным конкурентным преимуществом белорусской экономики должна быть подготовка образованных и высококвалифицированных кадров. Это создаст благоприятную среду для входа в новую глобальную экономику знаний.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ